формаў культурнага і грамадскага жыцця, садзейнічаць самастойнасці ў паводзінах і учынках асобы, фарміраваць творчую індывідуальнасць будучага спецыяліста, прадугледжвае вырашэнне пры дапамозе вучэбна-метадычнага комплексу наступных галоўных **задач**:

– паказаць ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі і культурнай ідэнтыфікацыі асобы;

– вызначыць ролю і прызначэнне мовы ў жыцці чалавека;

– даць студэнтам трывалыя веды па лінгвістычнай тэорыі і выпрацаваць на іх аснове аналітычныя і канструктыўныя ўменні, звязаныя з распазнаваннем, класіфікацыяй і навуковай інтэрпрэтацыяй разнастайных моўных адзінак;

– развіваць здольнасці студэнтаў, неабходныя для ўспрыняцця, разумення, трансфармацыі, стварэння тэкстаў багатага духоўнага зместу, разнастайных па жанравай і стылістычнай накіраванасці;

– стымуляваць актыўную дзейнасць студэнтаў як умову паспяховай ідэнтыфікацыі індывіда ў грамадстве.

Стварэнне эфектыўнага і сучаснага навукова-метадычнага комплексу з'яўляецца адной з галоўных перадумоў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі. Ад якаснага дыдактыка-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу залежыць падрыхтоўка спецыялістаў, якія ў аднолькавай ступені будуць валодаць не толькі высокім прафесіяналізмам, але таксама агульнакультурным патэнцыялам.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беспалько В. П. Педагогика и прогрессивные технологии обучения. – М., 1995.

2. Образовательный стандарт. Высшее образование. Цикл социально-гуманитарных дисциплин. Руководящий документ Республики Беларусь. Министерство образования Республики Беларусь. – Мн., 1999.

3. Учебно-методический комплекс: модульная технология разработки: Учебно-методическое пособие / А.В. Макаров, З.П. Трофимович, В.С. Вязовкин, Ю.Ю. Гафарова. – Мн.: РИВШ БГУ, 2001.

УДК 371.3:378

В.К. Мароз, дацэнт; А.А. Крыварот, выкладчык МІК

# ДА ПРАБЛЕМЫ ЎВЯДЗЕННЯ ІНАВАЦЫЙ У АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС

In the article the theoretical aspects in introduction of new ideas innovation and novelty into the pedagogical science and educational sphere.

Неабходнасць фарміравання ў моладзі прынцыпова новага светапогляду з'яўляецца найважнейшай мэтай сістэмы адукацыі. Гэта будзе спрыяць адэкватнаму ўспрыняццю сутнасці і наступстваў глабальных працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным свеце. Невыпадкова XXI стагоддзе аб'яўлена ЮНЕСКА стагоддзем адукацыі. Таму сёння ў педагогіцы ўсё больш настойліва гучаць галасы пра неабходнасць зменаў ва ўсёй адукацыйнай сістэме. Новаўвядзенні (інавацыі) у сферы адукацыі ў рэчышчы глабальных адукацыйных тэндэнцый набываюць пашырэнне ў шмат якіх краінах свету, у тым ліку і ў Рэспубліцы Беларусь.

Паняцце *інавацыя* (з лацінскай мовы абнаўленне, змены, увод чагосьці новага, увядзенне навізны) з'явілася ўпершыню ў даследаваннях культуролагаў XIX стагоддзя і

абазначала ўвядзенне некаторых элементаў адной культуры ў другую. У пачатку XX стагоддзя стала складвацца новая галіна ведаў – навука пра новаўвядзенні *інаватыка*, якая вывучала заканамернасці ўвядзення новага ў сферу матэрыяльнай вытворчасці. У 30-я гады ў ЗША назіраецца выкарыстанне тэрмінаў *інавацыйная палітыка фірмы, інавацыйны працэс*. Інавацыі ўласцівыя любой прафесійнай дзейнасці чалавека. Яны не ўзнікаюць самі па сабе, а з'яўляюцца вынікам навуковых пошукаў. Ад 60-х гадоў XX ст. вучоныя пачалі спецыяльна даследаваць інавацыйныя працэсы ў сферы адукацыі. Адносна да педагагічнага працэсу інавацыя азначае ўвядзенне новага ў мэты, змест, метады і формы навучання і выхавання, арганізацыю сумеснай дзейнасці выкладчыка і студэнта.. Сучасная педагагічная навука адрозніває паняцці *навізны* (у значэнні *новы сродак*), а з другога боку, *інавацыі* (у значэнні *новаўвядзенне*). Навізна разглядаецца як новы метад, методыка, тэхналогія, праграма і г. д., а інавацыя – як расцягнуты ў часе працэс, які развіваецца па пэўных этапах. Такім чынам, у літаратуры паняцце інавацыі разглядаецца і як навізна, змена, абнаўленне, і як працэс увядзення новага.

Даследчыкі маюць на ўвазе паняцце навізны як стрыжнёвае паняцце сучаснай педагогікі, як крытэрый ацэнкі працы даследчыкаў, як найважнейшы вынік самога працэсу даследавання і як вартаснасць любога новаўвядзення. Некаторыя разумеюць пад новым толькі ўпершыню створанае, раней невядомае, якое прыроўніваецца да адкрыцця. Іншыя лічаць, што паняцце навізны ўбірае ў сябе і пераўтварэнне старых схем, кампанентаў, бо нельга ўводзіць навацыі, якія могуць разбурыць ранейшую сістэму. Інавацыйная дзейнасць, якая не ўлічвае набыткі выхаваўчай, адукацыйнай, гаспадарчай тэорыі і практыкі, на жаль, не забяспечвае ні нарошчвання пазітыўнага вопыту, ні распрацоўкі методык і тэхналогій адукацыйнага працэсу. Разам з тым не раіцца выкарыстоўваць замежныя тэхналогіі і падручнікі без адаптацыі да раней усталяванай сістэмы арганізацыі зместу і метадаў адукацыі. Вызначыўся падзел інавацый на дэструктыўныя і канструктыўныя. С.В. Папоў прапануе такую тэарэтычную мадэль інавацыйных працэсаў у адукацыі:




Пад тэрмінам *змены* ў адукацыі трэба разумець любую навізну, якую можна зафіксаваць эмпірычна і якая нават у нязначнай ступені змяняе працэс функцыянавання сістэмы (адукацыйнай практыкі).

Сёння ў інавацыйным працэсе найбольшую эфектыўнасць мае мэтанакіраваная, спланаваная і дакладна арганізаваная дзейнасць калектываў даследчыкаў і педагогаў, а не спантанныя, частковыя, неарганізаваныя пошукі асобных практыкаў.

Поспех любога новаўвядзення залежыць ад практычнай дзейнасці выкладчыка (педагога) па засваенні і выкарыстанні навізны. Адной з самых складаных праблем з'яўляецца фарміраванне гатоўнасці выкладчыкаў-педагогаў да засваення і выкарыстання інавацый у сваёй прафесійнай дзейнасці. Даследчыкі вызначаюць пяць асноўных груп педагогаў па іх адносінах да інавацый: 1) наватары (да 3%), 2) раннія рэалізатары (да 14%), 3) папярэдняя большасць (да 34%), 4) позняя большасць (да 33%), 5) тыя, што хістаюцца (да 16%). Існуе і спрошчаны падзел на наватараў і кансерватараў. Інавацыйны працэс патрабуе актыўнага пошуку ў навучальных установах наватараў, пастаяннага выяўлення лідэраў, мэтанакіраванага далучэння большасці педагагічнага калектыву да засваення інавацыйных метадаў. Акрэсленая праблема вымагае апераджальнай падрыхтоўкі выкладчыкаў-педагогаў.

Паказчыкі, выяўленыя псіхолагамі адносна матывацыі студэнтаў да вучобы, паказваюць, што толькі 5% студэнтаў не прапускаюць любой зручнай магчымасці здабыць новую інфармацыю, а 11% абсалютна не праяўляюць зацікаўленасці да вучобы. У астатніх успрымальнасць да ведаў праяўляецца ці пры моцным пабуджальным фактары, ці пры інтэнсіўнай арганізацыі вучэбнага працэсу. Рэфератыўная форма навучання – важны сродак павышэння пазнавальнай актыўнасці студэнтаў. Гэта развівае ў студэнтаў здатнасць да самастойнай працы з літаратурай і іншымі крыніцамі. Апошнімі гадамі распрацаваны новыя метады, якія здольны надаць паводзінам студэнтаў на лекцыях і семінарскіх (практычных) занятках актыўны характар. Напрыклад, дыялогавыя методыкі прадугледжваюць сітуацыю роўнай зацікаўленасці студэнтаў і выкладчыкаў. Спецыялісты арыентуюць на дыялог у межах тэм, вызначаных каляндарным планам, а таксама на неабходнасць прытрымлівацца прадметнай прасторы дыялогу. Гэта дазваляе пазбегнуць анархічнага абмену інфармацыяй. Акрэсліўся шэраг крытэрыяў фарміравання дакладнай прадметнай прасторы дыялогу: строгасць, яснасць, дакладнасць, несупярэчлівасць і канцэптуальнасць мыслення. На першым курсе некаторыя спецыялісты раяць устрымлівацца ад правядзення семінарскіх (практычных) заняткаў у форме дыспуту, абгрунтоўваючы гэта тым, што студэнты часам псіхалагічна сціснутыя і не заўсёды адгукаюцца на ініцыятыву выкладчыка, вельмі рэдка праяўляюць яе самі.

ВНУ адрозніваецца ад школы большым аб'ёмам вучэбнага матэрыялу і методыкай навучання, у якой заключаны творчы пачатак. Сярэдняя школа не спраўляецца з задачай фарміравання ў вучняў навыкаў самастойнай працы. Таму многія з іх недастаткова падрыхтаваны да вучобы ў вышэйшых адукацыйных установах. Асноўная маса першакурснікаў не можа рацыянальна арганізаваць сваю вучэбна-пазнавальную дзейнасць і дастаткова эфектыўна рыхтавацца да заняткаў. Не хапае вопыту ўдзелу ў дыскусіях, абароны сваёй пазіцыі, у сувязі з чым выкладчык мусіць дапамагчы студэнту далучыцца да самастойнай творчасці, прывіць навыкі пошуку, збору, аналізу і апрацоўкі карыснай інфармацыі.

Працэс пашырэння інавацыйных тэхналогій у сферы адукацыі не павінен зводзіцца да уніфікацыі педагагічна-выкладчыцкай дзейнасці. У сваю чаргу, выкладчык мусіць у разумных межах выбіраць найбольш эфектыўныя і аптымальныя методыкі правядзення заняткаў. Інавацыі і традыцыі – два ўзаемадапаўняльныя кампаненты адукацыйнага працэсу.

ЛІТАРАТУРА

1. Жук А.И. Теоретико-методологические и организационно-управленческие проблемы инновационных процессов в современной школе // Кіраванне ў адукацыі, 2000. – № 1. – С. 14 – 34.

2. Инновационные технологии педагогического процесса: Метод. рек. – Гродно: ГрГУ, 2000. – 58 с.

3. Инновации в системе повышения квалификации педагогических кадров: Теория и практика. В 2 ч. – Мн., 2000. – 195 с.

4. Краснов Ю.Э. Опыт перестройки: в качестве социально-педагогических инноваций // Кіраванне ў адукацыі, 2000. – № 4. – С. 3–27.

УДК [332.72+332.8](476)

Н.Г. Синяк, доцент

## ЗАРУБЕЖНЫЙ ОПЫТ И ПОТЕНЦИАЛ РАЗВИТИЯ ОБРАЗОВАНИЯ В СФЕРЕ НЕДВИЖИМОСТИ И ДИСТАНЦИОННОГО ОБУЧЕНИЯ В БГТУ

In the article the results of the foreign and domestic experience analysis of education in sphere of the real estate and distance learning are given. The peculiarities and advantages of development of the new forms of training are shown.

Образование занимает одно из первых мест в стратегии развития Беларуси и многих зарубежных государств, т. к. является основой для устойчивого экономического роста. Все сектора экономики, обеспечивающие экономический рост государства, объединяет Знание как один из основных источников процветания и благосостояния общества и Недвижимость, являющаяся той пространственной средой, в которой осуществляется любая человеческая деятельность. Недвижимое имущество является важнейшим экономическим ресурсом любого государства, любой отрасли экономики, любого предприятия. В целом на долю недвижимости приходится более 50% мирового богатства.

Понимая значимость и перспективность подготовки специалистов в сфере недвижимости, БГТУ начинает осваивать новое образовательное направление для вуза – специализацию «Менеджмент недвижимости». Для придания международного авторитета образованию специалистов в сфере недвижимости в БГТУ была проделана работа по налаживанию связи с образовательными учреждениями в Европе. Результатом этой работы стало то, что наряду с 20 другими вузами Европы университет был включен в образовательную сеть вузов, готовящих специалистов по недвижимости. Целью создания сети была гармонизация образования в сфере недвижимости в Европе. Первым шагом в этом процессе стало изучение опыта ряда Европейских государств (Великобритании, Ирландии, Франции, Германии, Финляндии) в этом направлении. Ближе всего нам оказался опыт Германии. Используя учебные планы и программы немецких университетов и учитывая специфику БГТУ, мы в качестве «фундамента знаний» менеджера недвижимости выделили четыре основополагающих блока: технологический, строительный, финансово-экономический и юридический. Основными будут экономический и технологический блоки.

При изучении этих блоков студент должен будет освоить следующие специальные дисциплины: основы строительного производства, строительные материалы и изделия, экономику недвижимости, землеустройство и земельный кадастр, геоинформа-